А.Ю. Лозка,
начальнік аддзела традыцыйнай культуры і аматарскай творчасці
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

# Метадычныя асаблівасці выкладання і змест адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі па тэматыцы «Фальклорна-абрадавая дзейнасць»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграма павышэння кваліфікацыі «Фальклорна-абрадавыя традыцыі ў структуры сацыякультурнай дзейнасці», якая рэалізуецца Інбелкультам, адрасавана спецыялістам клубных устаноў, метадычных цэнтраў.

У першым раздзеле праграмы раскрываюцца сацыякультурныя і псіхолага-педагагічныя аспекты ў рабоце арганізатара культурна-адпачынкавай дзейнасці, у другім раздзеле адлюстроўваюцца змест фальклорна-абрадавых традыцый і магчымасці для культурна-адпачынкавай дзейнасці і ў трэцім — прынцыпы, арганізацыя і метадычныя асаблівасці сацыякультурнай дзейнасці.

Каб быць канкурэнтаздольнымі на рынку культурных паслуг, важным аспектам засваення слухачамі любой праграмы з'яўляецца прымяненне выкладчыкамі інавацыйных сродкаў. Варта шырока рэалізоўваць метады актыўнага навучання (дзелавыя гульні, групавыя абмеркаванні, трэнінгі, камп'ютарнае навучанне, разбор практычных сітуацый і інш.) [7, с. 382—402].

Работнікі культуры павінны ведаць асноўныя тэндэнцыі і прыярытэты дзяржаўнай культурнай палітыкі, а таксама валодаць прафесійнымі навыкамі дзеля яе здзяйснення. Актуальнымі з'яўляюцца пытанні агульнакультурнай падрыхтаванасці супрацоўніка ўстановы культуры, да якіх адносяцца:

веданне фальклору, яго сацыяльнае і мастацкае значэнне, яго роля ў эстэтычным выхаванні і развіцці аматарскай творчасці;

уменне разбірацца ў з'явах мастацка-эстэтычнай культуры (веданне айчыннай і замежнай музычнай літаратуры, найбольш вядомых твораў, іх асаблівасцей);

валоданне навыкамі аргументаванай эстэтычнай ацэнкі праслуханых музычных твораў, іх даходлівае тлумачэнне ўдзельнікам калектыву;

разуменне і адчуванне прыгожага ў чалавеку, прыродзе, з'явах духоўнай культуры, імкненне быць прыкладам культурных зносін для ўдзельнікаў калектыву ў побыце, працы, адпачынку;

пастаяннае імкненне да пашырэння свайго агульнакультурнага ўзроўню;

уменне абмяркоўваць, аналізаваць, ацэньваць з удзельнікамі калектыву з'явы мастацкага жыцця ў краіне і за мяжой [1, с. 107—108].

Псіхолага-педагагічная кампетэнцыя супрацоўніка ўстановы культуры ўлічвае яго падрыхтаванасць і ўключае:

веданне асноў псіхалагічнага развіцця асобы, уменне прымяняць гэтыя веды ў рабоце з рознаўзроставымі катэгорыямі ўдзельнікаў калектыву, выкарыстоўваючы індывідуальныя метады;

веданне псіхалогіі музычнага ўспрыняцця фальклору, псіхолага-педагагічных заканамернасцей фарміравання музычна-пазнавальнай дзейнасці рознаўзроставых груп;

уменне і гатоўнасць выкарыстоўваць разнастайныя формы і метады педагагічнай дзейнасці, сродкі выхаваўчага ўздзеяння;

уменне аналізаваць педагагічныя працэсы і з'явы як ва ўласнай прафесійнай рабоце, так і ў дзейнасці іншых кіраўнікоў калектываў;

здольнасць праводзіць розныя формы заняткаў, даходліва перадаваць веды ўдзельнікам калектыву, крытычна ацэньваць іх вынікі;

здольнасць аналізаваць і ўлічваць у сваёй рабоце перадавы вопыт лепшых кіраўнікоў клубных фарміраванняў;

уменне падбіраць фальклорны матэрыял для авалодання ім удзельнікамі калектыву;

валодаць методыкай выхавання ў калектыўнай дзейнасці [1, с. 108].

Адной з важных задач рэалізацыі адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі з'яўляецца перадача ведаў слухачам на аснове новых дасягненняў навукі.

Так, напрыклад, слухачы атрымліваюць уяўленне пра новыя тэндэнцыі ў разуменні паходжання свят народнага календара ў межах тэмы «Беларускі народны каляндар у сістэме культурна-адпачынкавай дзейнасці» на аснове апошніх даследаванняў. Як вядома, у фалькларыстыцы існуе агульнае разуменне паходжання традыцыйных свят, якое зводзіцца да высновы, што яны маюць язычніцкія карані. Тэорыя адлюстравання каляндарных стыляў у беларускім фальклоры, прапанаваная ў шэрагу выданняў [5; 6], значна дапаўняе і тлумачыць актуальную тэму. Найбольш значныя святкаванні, адлюстраваныя ў абрадава-паэтычных комплексах, звязаны з адзначэннем нашымі продкамі асноўных дзён, ад якіх пачынаўся адлік у годзе. Такіх дзён у гісторыі народаў было некалькі, і гэта тлумачыцца пошукам імі аптымальных сродкаў летазлічэння.

Важнымі для спецыялістаў устаноў культуры з'яўляюцца і іншыя актуальныя тэмы, уключаныя ў праграму: «Святочна-абрадавыя традыцыі як элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны: інвентарызацыя і ахова», «Рэгіянальныя песенныя сістэмы Беларусі і абрадавая практыка», «Народныя гульні: класіфікацыя, выкарыстанне ў сучаснай культурнай дзейнасці ў вольны час», «Інтэрпрэтацыя і тэатралізацыя каляндарнага свята на аснове народных традыцый. Агульнаэтнічнае, рэгіянальнае і лакальнае ў каляндарнай абраднасці і паэзіі», «Сямейныя абрады: народныя традыцыі і асаблівасці сцэнічнага ўвасаблення».

У трэцім раздзеле праграмы слухачам прапануецца шырокае кола пытанняў, звязаных з прафесійнай кампетэнтнасцю, набыццём практычных навыкаў арыентацыі ў складаных праблемах культурнай рэчаіснасці. Асноўны спектр метадычных напрацовак прадстаўлены аспектамі, якія раскрываюць розныя тыпы фальклярызму ў культурна-адпачынкавай дзейнасці, сцэнічнага ўвасаблення традыцыйных свят



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і абрадаў, іх сучаснай рэжысуры і тэатралізацыі. Акрамя таго, разглядаецца разнастайны прафесійны вопыт, тэхналогіі стварэння этнакультурных праектаў, рэклама і PR як інавацыйныя метады папулярызацыі народнай творчасці, камп'ютарныя тэхналогіі ў музычным афармленні абрадаў і свят. Падчас круглых сталоў і майстар-класаў, прысвечаных разнастайным тэхналогіям, слухачы набываюць новыя веды, уменні, неабходныя ў працы спецыялістам метадычных цэнтраў народнай творчасці і клубных устаноў.

Падчас рэалізацыі адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі па тэматыцы «Фальклорна-абрадавая дзейнасць» ужываюцца як традыцыйныя (вербальныя і наглядныя), так і інтэрактыўныя (гульнёвыя і інш.) метады навучання. Выкарыстоўваюцца мультымедыйныя і камп'ютарныя сродкі навучання, дэманструюцца відэаматэрыялы.

Так, пры вывучэнні тэмы «Інтэрактыўны метад у рабоце з батлеечным тэатрам» рэкамендуецца правядзенне майстар-класа з выкарыстаннем інтэрактыўнага метаду, камп'ютарных і наглядных сродкаў навучання, асноўная мэта якога практычнае выкарыстанне эфектыўнага метаду ў рабоце з батлеечным тэатрам падчас рэжысёрскай работы над спектаклем. Педагогі могуць прымяняць гэты метад у сваёй дзейнасці ў клубных фарміраваннях, каб навучыць удзельнікаў «вадзіць» лялькі-персанажы ў адпаведным спектаклі.

Інтэрактыўны кампанент уводзіцца падчас:

дэманстрацыі відэазапісу спектакля, які рыхтуецца загадзя, або бярэцца спецыяльны кампакт-дыск, напрыклад, па містэрыяльнай драме «Цар Ірад» [2]. Можна паўтарыць спектакль для замацавання паказам з натуральнымі лялькамі ў батлейцы;

размеркавання роляў п'есы, яе выканання (пад кіраўніцтвам настаўніка-рэжысёра «артысты» водзяць лялькі ў батлейцы пад агучванне тэксту іншымі, прапануецца выкарыстоўваць адаптаваныя тэксты традыцыйнай драмы са спецыяльных дапаможнікаў) [3, с. 57—61; 4, с. 22—30; 8, с. 118—125; 9, с. 26—30];

ваджэння размеркаваных лялек пад фанаграму;

ваджэння размеркаваных лялек з вывучаным тэкстам;

ваджэння «артыстам» лялек пад агучванне тэксту іншымі «артыстамі»;

ваджэння «артыстам» лялек з вывучаным тэкстам;

удасканалення акцёрскіх здольнасцей пачынаючага батлейшчыка.

Слухачы асвойваюць асноўныя прынцыпы, формы і методыкі работы з вуснапаэтычным матэрыялам, якія ў далейшым выкарыстоўваюцца імі ў прафесійнай дзейнасці.

Калі кіраўнік фальклорнага калектыву не мясцовы жыхар (што часцей за ўсё здараецца на практыцы), яму патрэбна перш за ўсё вывучыць спецыфіку мясцовага стылю, якому ўласцівы:

характэрныя народныя традыцыі, звычаі і абрады, асаблівасці жыццёвага ўкладу;

асаблівасці дыялекту канкрэтнай мясцовасці;

спецыфіка музычнай і песеннай фактуры (аднагалосны песенны стыль, двухгалоссе, спевы «з пералівамі», «з падгалоскам», шматгалоссе, адпаведная манера гукаатрымання на музычных інструментах, мясцовая манера спеваў і г.д.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характэрныя прыметы адзення, касцюмаў, рамесніцкага мастацтва, рукадзелля, ткацтва, разьбы па дрэву, спецыфічныя элементы дэкаратыўна-прыкладнога майстэрства [1, с. 102].

Пры арганізацыі свят народнага календара выкарыстоўваюцца прынцыпы, якія адпавядаюць этнакультурным традыцыям рэгіёнаў і агульнакультурным патрабаванням:

каляндарнай адпаведнасці (прымеркаванне свята да адпаведнай даты народнага календара);

рэгіянальнага ці этнаграфічнага прызначэння (выкарыстанне ў мясцовых святах разнастайнага рэгіянальнага матэрыялу з нематэрыяльнай і матэрыяльнай народнай спадчыны);

натуральнага асяроддзя (выкарыстанне прыродных «пляцовак» правядзення свята);

маральна-эстэтычнага адбору (выбар і апрацоўка фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу, які адпавядае сённяшнім уяўленням мастацкасці і эстэтычнага густу);

педагагічнай накіраванасці (узроставая і нацыянальна-моўная адпаведнасць, павучальнасць, выхаваўчы эфект).

Такім чынам, работу ўстаноў культуры неабходна скіроўваць на сацыякультурную дзейнасць з рэгіянальным фальклорам, народнай творчасцю свайго краю. Увасабленне песенных і абрадавых традыцый мастацкім калектывам павінна адпавядаць метадычным прынцыпам, якія прадугледжваюць развіццё мясцовай спецыфікі фальклорнага стылю, а кіраўнік клубнага фарміравання павінен мець высокую прафесійную падрыхтоўку, валодаць сучаснымі педагагічнымі тэхналогіямі.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Аляхновіч, А.М.* Народная песня ў мастацкай самадзейнасці / А.М. Аляхновіч. — Мінск : Універсітэцкае, 1991. — 111 с.
2. *Баброўская, К.* Дапаможнік лялечніка : электрон. дапам. / К. Баброўская, А. Лозка [Электронны рэсурс]. — Мінск, 2011. — (DVD-ROM).
3. *Лозка, А.* Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні : дапам. для настаўнікаў, выхавальнікаў, кіраўнікоў гурткоў / А. Лозка. — Мінск : Тэхналогія, 1997. — 183 с.
4. *Лозка, А.Ю.* Беларуская фалькларыстыка : традыцыйны тэатр : вучэб.-метад. дапам. / А.Ю. Лозка. — Мінск : БДПУ, 2009. — 56 с.
5. *Лозка, А.Ю.* Феномен каляндарных стыляў беларускага фальклору / А.Ю. Лозка // Праблемы ўсходнеславянскай этналінгвістыкі : матэрыялы Першай міжнар. навук. канф. (Мінск, 25—26 красавіка, 2003 г.). — Мінск, 2003. — С. 146—152.
6. *Лозка, А.Ю.* Феномен Новага года ў беларускім фальклоры : манаграфія / А.Ю. Лозка. — Мінск : БДПУ, 2004. — 165 с.
7. Организация деятельности учреждений культуры клубного типа : учеб. пособие / под общ. ред. Н.П. Гончаровой. — СПб : Лань; Планета музыки, 2015. — 448 с. (+CD).
8. Тэатралізаваныя школьныя святы / аўт.-укл. А.Ю. Лозка і І.І. Кірчук. — Мінск : БелЭн, 2004. — 176 с.
9. Тэатр лялек : дапам. для выхавальн. дашк. устаноў / пад рэд. А.Ю. Лозкі. — Мінск : Полымя, 1998. — 203 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ